# Юбилеи

# Юбілеі

# Jubilees



## Вячеслав Петрович РАГОЙША

## Вячаслаў Пятровіч РАГОЙША

## Viachaslau Piatrovich RAHOJSHA

Выдатны знаўца літаратуры, стваральнік новых напрамкаў у навуцы, арганізатар навуковых доследаў і вучэбнага працэсу на філалагічным факультэце БДУ, бліскучы выкладчык, крытык, паэт, эсэіст, перакладчык, энцыклапедычна адукаваны філолаг Вячаслаў Пятровіч Рагойша падышоў да свайго слаўнага юбілею – 80-годдзя.

Асоба В. П. Рагойшы з’яўляецца выключнай у сучаснай беларускай культуры. Цяжка назваць напрамак у літаратуразнаўстве, які быў бы па-за ўвагай Вячаслава Пятровіча. Па колькасці друкаваных прац (больш за 1000!) В. П. Рагойша трымае бясспрэчнае першае месца сярод тэарэтыкаў літаратуры. З яго навуковых манаграфій і зборнікаў артыкулаў (аднаасобных і ў суаўтарстве), якія характарызуюцца сваім надзвычай высокім узроўнем, вылучым наступныя: «Сяргей Палуян. Лісты ў будучыню», «Слядамі знічкі», «Стары Улас. Год беларуса», «Янка Купала. Жыве Беларусь», «Кантакты», «І нясе яна дар…», «Напісана рукой Купалы», «Паэтыка Максіма Танка», «Пераклаў Якуб Колас», «І адгукнецца слова ў слове…», «Вяршыні. З невядомага і забытага пра Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча».

Ва ўсіх працах В. П. Рагойшы зроблены адкрыцці фактычнага характару (вынік напружанай працы даследчыка ў архівах) і сцверджаны навуковыя ідэі, якія сталі ўжо тэарэтыка-літаратурнымі пастулатамі.

Асноўная сфера навуковых інтарэсаў Вячаслава Пятровіча – жыццё і творчасць класікаў беларускай літаратуры, але нярэдка навуковец выступае і як крытык, займаючыся актуальнымі бягучымі праблемамі літаратурнага працэсу. Увогуле ён умее ўлоўліваць «лініі перасячэння» новых сучасных з’яў з непераходзячымі вечнымі, як мала хто з філолагаў.

В. П. Рагойша з’яўляецца выдатным знаўцам беларускай і сусветнай паэзіі, аўтарам унікальнага энцыклапедычнага выдання «Паэтычны слоўнік», якое не раз перавыдавалася.

Вячаслаў Пятровіч – найлепшы ў беларускім навуковым дыскурсе тэарэтык перакладу і перакладчык-практык.

CC BY NC

Юбіляр заўсёды прытрымліваўся нацыянальнай сістэмы поглядаў. Пры гэтым ён пастаянна цікавіўся іншымі літаратурамі Еўропы. Так, разам з жонкай Таццянай Вячаславаўнай Кабржыцкай ён найбольш поўна ў беларускай навуцы і літаратуры даследаваў сувязі беларускай і ўкраінскай культур, а таксама ўзаемадачыненні беларускай літаратуры з іншымі славянскімі літаратурамі.

В. П. Рагойша меў дачыненне да стварэння ў 1994 г. кафедры тэорыі літаратуры на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і быў яе загадчыкам больш за 20 гадоў.

З моманту ўзнікнення кафедры Вячаслаў Пятровіч узяў курс на арганічнае зліццё адукацыі і навукі. Пад яго кіраўніцтвам праводзілася вялікая навукова-даследчая работа, у якой актыўна ўдзельнічалі не толькі выкладчыкі, але і аспіранты, магістранты, студэнты. Ні адна кафедра на філалагічным факультэце БДУ, апроч той, што ўзначальваў Вячаслаў Пятровіч, не выйгравала столькі студэнцкіх грантаў на распрацоўку навуковых тэм. У кнізе «Філалагічны факультэт. Да 70-годдзя існавання» (2009) пра ўнікальную кафедру тэорыі літаратуры сказана: «Супрацоўнікі кафедры асэнсоўваюць тэарэтычныя аспекты развіцця беларускай вуснай народнай паэтычнай творчасці і беларускага прыгожага пісьменства, вывучаюць асобныя пытанні тэорыі літаратуры (цэласнасць мастацкага твора, вершаванне, літаратурная вобразатворчасць і г. д.), даследуюць усходнеславянскую міжлітаратурную супольнасць XX ст., класічныя і некласічныя мадэлі свету ў фальклоры і літаратуры, аналізуюць “вузкія месцы” ў вывучэнні праблем тэорыі літаратуры і літаратурных сувязей у сярэдніх навучальных установах і ВНУ і інш.»[1].

Пры кафедры В. П. Райгошам створана і актыўна працуе адзіная ў вышэйшых навучальных установах Беларусі лабараторыя беларускага фальклору, якая таксама праводзіць значную навукова-даследчую работу.

Кожная лекцыя Вячаслава Пятровіча заўсёды суправаджаецца апладысментамі студэнтаў і магістрантаў. На заліках і экзаменах В. П. Рагойша – узор вытрымкі і добразычлівасці да маладых людзей. Увогуле ён заўсёды вылучаўся выключнай інтэлігентнасцю.

У Вячаслава Пятровіча шмат вучняў і паслядоўнікаў: былыя студэнты, магістранты, аспіранты, дактаранты. Ёсць у яго вучні нават у Грузіі і Кітаі. Да тых, каго ён выправіў у навуковую дарогу, непасрэдна кіраваў напісаннем дыпломных і дысертацыйных прац, можна дадаць шматлікіх кандыдатаў і дактароў навук, чые інтарэсы ён адстойваў не менш як дзесяць гадоў у Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, а таксама тых, хто сёння абараняецца ў дысертацыйным савеце пад яго старшынствам.

Вучні Вячаслава Пятровіча – гэта і мы, калегі, якія не толькі былі яго студэнтамі і аспірантамі, але і працавалі або працуюць з ім. Так, доўгі час пад навуковым кіраўніцтвам В. П. Рагойшы калектыў аўтараў стварaў падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры для школы (спачатку для школы з паглыбленым вывучэннем мовы і літаратуры, а потым – для базавай). У выдадзеных пад рэдакцыяй Вячаслава Пятровіча падручніках для паглыбленага вывучэння мовы і літаратуры было зроблена шмат адкрыццяў не толькі ў плане зместу, фактуры, але нават і ў метадычным плане.

Вячаславам Пятровічам напісана асобна і ў суаўтарстве каля 30 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў і школьнікаў. Найбольш значныя з іх наступныя: «Беларуская літаратура XIX ст. Хрэстаматыя», «Паэтычны слоўнік» (чатыры выданні), «Тэорыя літаратуры ў тэрмінах», «Украінская літаратура і ўкраінска-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі» (у трох частках), «Тэксталогія» і інш.

Гаворачы пра вучобу ў В. П. Рагойшы, нельга не сказаць пра самых галоўных і, бясспрэчна, любімых яго вучняў – родзічаў: жонку (яна самастойны і вельмі глыбокі даследчык, але не без уплыву мужа), трох сыноў, нявестку, унукаў. Усе сыны Вячаслава Пятровіча атрымалі не адну вышэйшую адукацыю, два з іх (а таксама жонка і нявестка) з’яўляюцца кандыдатамі філалагічных навук.

В. П. Рагойша – лідар, бліскучы арганізатар, чалавек пасіянарны. Апошняя якасць – прымета яго роду. Гераічная біяграфія ў яго бацькі. Няпростыя, драматычныя (бо жылі ў драматычны час) лёсы і ў іншых родзічаў Вячаслава Пятровіча, пра якіх ён сам пакінуў успаміны, паказаўшы сябе выдатным мемуарыстам. Надзвычай цікавыя яго ўспаміны і пра сябра, класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча.

Вячаславу Пятровічу пашчасціла з родзічамі, сябрамі і настаўнікамі. Сярод апошніх – Міхась Рыгоравіч Ларчанка, кіраўнік кандыдацкай дысертацыі маладога вучонага, Алег Антонавіч Лойка, разам з якім яны стварылі некалькі вучэбных дапаможнікаў, дружна працавалі на адной кафедры, а таксама Адам Іосіфавіч Мальдзіс, які, яшчэ працуючы пасля заканчэння БДУ ў раённай газеце «Знамя Ильича», заўважыў таленавітага юнака і рэкамендаваў да друку ў выданні вершы школьніка Рагойшы. У дастаткова сталым узросце Вячаслаў Пятровіч працаваў пад кіраўніцтвам А. І. Мальдзіса ў Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтры імя Ф. Скарыны.

В. П. Рагойша, магчыма, як ніхто з беларускіх выдатных дзеячаў навукі XX–XXI стст., знітаваны са сваёй малой радзімай – Ракаўшчынай (Мінская вобласць), якой Вячаслаў Пятровіч прысвяціў шматлікія доследы, мемуарныя нататкі, вершы.

[1]Філалагічны факультэт. Да 70-годдзя заснавання / рэдсавет: І. С. Роўда (старш.) [і інш.]. Мінск, 2009. С. 141.

Доўгі час ён на свае сродкі выдаваў краязнаўчую газету «Ракаўскі шлях», дзе пісаў пра гісторыю горада, краю, знакамітых землякоў. У гэтым перыядычным выданні друкаваліся выдатныя беларускія мысліцелі, пісьменнікі, дзеячы мастацтва, якія мелі дачыненне да Ракава. Газета «Ракаўскі шлях» – з'ява ўнікальная, у выданні сабраны багацейшы матэрыял пра адзін з цэнтральных рэгіёнаў Беларусі.

Акрамя таго, В. П. Рагойша стварыў у вясковым доме сваіх бацькоў Музей поліэтнічнай культуры Ракаўшчыны, дзе захоўваюцца рэчы, дакументы, друкаваныя матэрыялы тых творцаў з Беларусі, Украіны, іншых краін, якія гасцявалі ў яго. Асабліва каштоўнымі з'яўляюцца тыя рэчы, што належалі У. Караткевічу, які бываў у доме бацькоў В. П. Рагойшы неаднаразова. Тут захоўваецца нават яго канапа. У год юбілею У. Караткевіча (2010) Вячаслаў Пятровіч дамогся, каб на яго доме ўлады дазволілі павесіць мемарыяльную дошку, што нагадвала б пра выдатнага пісьменніка. Дошку на грамадскіх пачатках зрабіў знакаміты беларускі скульптар Іван Акімавіч Міско. Натуральна, усе выдаткі па яе адліўцы і ўзвядзенню Вячаслаў Пятровіч узяў на сябе.

Не варта бачыць у гэтых акцыях – адкрыцці мемарыяльнай дошцы, арганізацыі музея – нейкае імкненне да самасцвярджэння. Уласная слава менш за ўсё хвалюе Вячаслава Пятровіча. У В. П. Рагойшы зусім іншая ідэя. Тут знаходзіцца яго родная сядзіба, месца злучэння роду і зямлі, у міфалогіі – вышэйшая іерагамія (гарманічная лучнасць, саюз, шлюб). Любая сядзіба ўяўляе сабой не толькі эстэтычна-гаспадарчае пераўвасабленне пэўнай тэрыторыі, фарміраванне мастацкага ландшафту, але і абавязковую заяўку на жыццё ў пакаленнях, статус месца шчасця сям'і ў працяглым часе. Аднак паколькі яе ўладальнікі – сям'я незвычайная (усе інтэлігенты з сялянскімі каранямі), то і сядзіба павінна несці прыметы гэтай незвычайнасці, сцвярджаць і народную, і прафесійную культуру, нагадваць пра сапраўдны беларускі арыстакратызм: яго носьбіты – не магнаты, а заўзятыя працаўнікі, чые дзяды сеялі хлеб і пры гэтым стваралі найбагацейшы фальклор, а іх дзеці і ўнукі апантана вучыліся і рабіліся сапраўднымі прафесіяналамі ў розных галінах ведаў.

Сядзіба роду Рагойшаў з'яўляецца прыкладам для іншых, адна з яе звышзадач – выхаваўчая. Багатая культурная спадчына Ракава падштурхнула Вячаслава Пятровіча арганізаваць тут навуковыя чытанні, якія праходзілі на працягу шэрага гадоў. На мерапрыемства збіраліся навукоўцы з Беларусі, Украіны, Расіі, Прыбалтыкі, Вялікабрытаніі. На канферэнцыях ішла гаворка не толькі пра Ракаўшчыну, хоць гэта, безумоўна, галоўная тэма, але і ўвогуле пра значэнне малой радзімы ў жыцці і творчасці выдатных людзей. Чытанні мелі шырокі розгалас.

Лёс В. П. Рагойшы сведчыць пра вялікае значэнне ў жыццёвым шляху творцы месца яго нараджэння, уплыву бацькоў і родзічаў. А таму для паўнаты карціны прывядзём некалькі звестак біяграфічнага характару пра юбіляра.

Нарадзіўся Вячаслаў Пятровіч Рагойша 5 чэрвеня 1942 г. у вёсцы Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Ён быў адзіным дзіцём. Вучыўся В. П. Рагойша ў Ракаўскай сярэдняй школе. Як надзвычай здольны студэнт філалагічнага факультэта БДУ, ён быў заўважаны выкладчыкамі. Вячаслаў Пятровіч атрымаў дыплом з адзнакай у 1963 г., скончыў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ ў 1967 г. Служыў у войску ў 1966–1967 гг. З 1967 г. працаваў старшым выкладчыкам, затым дацэнтам на кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ. З 1988 па 1991 г. займаў пасаду дацэнта кафедры культуры Інстытута паліталогіі і сацыяльнага кіравання Камуністычнай партыі Беларусі. З 1991 па 1994 г. з'яўляўся намеснікам дырэктара Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны. З 1994 г. быў загадчыкам кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта БДУ. З 2016 г. – прафесар гэтай кафедры.

В. П. Рагойша абараніў кандыдацкую дысертацыю ў 1967 г. Доктарскую дысертацыю ён бліскуча абараніў у 1993 г. у Інстытуце сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага Расійскай акадэміі навук. Званне прафесара яму была нададзена ў 1994 г. З 1994 г. В. П. Рагойша з'яўляецца акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.

Доўгі час Вячаслаў Пятровіч быў прэзідэнтам Міжнароднага фонду Янкі Купалы, старшынёй секцыі беларускай мовы і літаратуры навуковаметадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. В. П. Рагойша – член беларускага камітэта славістаў, сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1969 г., заслужаны работнік адукацыі. Ён узнагароджаны медалём «20 лет Победы в Великой Отечественной войне», медалём і ордэнам Францыска Скарыны, шматлікімі граматамі.

***Т. І. Шамякіна***[2]

[2]*Татьяна Ивановна Шамякина* – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры теоретического и славянского литературоведения филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Таццяна Іванаўна Шамякіна* – доктар філалагічных навук, прафесар; прафесар кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Tatyana I. Shamyakina*, doctor of science (philology), full professor; professor at the department of theoretical and Slavic literary studies, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *shamyakina@tut.by*